# Узбагачаная соль пайшла на палі

Гарнякі першага Салігорскага калійнага камбіната працуюць у гэтыя дні з небывалым уздымам. Аб гэтым яскрава сведчыць ужо адзін той факт, што за паўтара месяца гэтага года на-гара выдадзена столькі сільвініту, колькі яго было выпрацавана за ўвесь першы квартал пятага года сямігодкі. Шаснаццаць экіпажаў горнапраходчых камбайнаў вядуць праходку саляных пластоў на другім і трэцім гарызонтах.

Шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва паміж гарнякамі. Уперадзе ідуць экіпажы камбайнаў Мікалая Мацюшына і Васіля Арыстава.

Першыя тоны ўзбагачанай солі атрымалі калгасы і саўгасы Любанскага і іншых вытворчых упраўленняў. Больш 570 тон яе ўжо пайшло на палеткі.

Справамі адказваючы на заклік роднай Камуністычнай партыі рашуча ўзяць курс на інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове шырокага прымянення ўгнаенняў, салігорскія гарнякі змагаюцца за тое, каб выдаць на-гара сёлета ў шэсць разоў больш сільвініту, чым летась.

Напружаная праца сведчыць аб тым, што з гэтай гаганаровай задачай яны справяцца паспяхова.